*В.А. МАКСІМОВІЧ*

# Я. КУПАЛА І М. БАГДАНОВІЧ: МАДЭРНІСЦКІ РАКУРС ТВОРЧАСЦІ

Новая сацыякультурная сітуацыя, агульны ўзровень навукова-даследчыцкай думкі патрабуюць разгляду як пэўных літаратурных эпох, перыядаў, этапаў, так і любой мастацкай з'явы ва ўзаемасувязі і ўзаемадзеянні розных мастацка-эстэтычных сістэм, напрамкаў, стыляў. Апраўданай і заканамернай у гэтай сувязі выглядае спроба паглядзець на пэўныя мастацкія феномены праз прызму пошукаў той эпохі, у якой яны былі створаны. Апошнія даследаванні ў кірунку франтальнага спасціжэння важнейшых працэсаў і тэндэнцый грамадскага, духоўнага і эстэтычнага жыцця пачатку XX ст., устаноўка на выяўленне асноўных заканамернасцей літаратуры як пэўнага гістарычнага этапу культурнага развіцця цалкам разбіваюць міф пра аднаўзроўневы і аднalінейны характар літаратурнага працэсу гэтага часу.

У якасці зыходнай канстанты варта прызнаць той факт, што беларуская літаратура пачатку стагоддзя развівалася не ізалявана ад іншых. Яе ўласны патэнцыял узбагачаўся вопытам іншанацыянальных літаратур. Зварот да разнастайных творчых прынцыпаў, актыўная апрабацыя новых ідэйна-эстэтычных канцэпцый, свядомая ўстаноўка на эксперыментатарства як у галіне мастацкага зместу, так і ў мастацкай форме станавіліся галоўнымі скпаднікамі яе ўласнай самадастатковасці, духоўнай сталасці. Гэта засведчыў, па сутнасці, і М. Багдановіч, гаворачы пра «кароткі паўтарыцельны курс еўрапейскіх пісьменніцкіх напрамкаў апошняга веку», які прайшла беларуская літаратура, адбіўшы ў сябе сентыменталізм, рамантызм, рэалізм і натуралізм, мадэрнізм[1]. М. Мушынскі ў гэтай сувязі заўважае, што прыведзеныя сведчанні вельмі важныя з пункту гледжання эвалюцыі літаратуразнаўчай метадалогіі Багдановіча. "Калі Багдановіч загаварыў пра "паўтарыцельны курс"..., дык гэта азначала, – падкрэслівае даследчык, – што ён узняўся да болей высокага разумення аб'ектыўных заканамернасцей развіцця літаратуры. Лагічна, што пры такім падыходзе шмат у чым страчвала свой сэнс ранейшае супрацьпастаўленне, скажам, рамантызму і рэалізму. Натуралізм і нават мадэрнізм таксама не маглі ўжо расцэньвацца... як менш каштоўныя ў параўнанні з рэалістычным кірункам. Усе яны мелі законнае права на існаванне і іх неабходна было вывучаць"[2].

У адрозненне ж ад еўрапейскага беларускі мадэрнізм не столькі з'яўляўся формай адмаўлення, адмежавання ад цывілізацыі і культуры, колькі сведчыў аб прыналежнасці да культурных здабыткаў чалавецтва, спрычыненасці да праблем сучаснай цывілізацыі, адным са шляхоў запаўнення культурнай нішы. Мадэрнізм быў гістарычнай неабходнасцю, адным са спосабаў выхаду нацыянальнай літаратуры на новыя эстэтычныя далягляды, прарывам да сусветнай мастацкай культуры. Яскравым прыкладам таму з'яўляецца постаць Багдановіча, праца якога ў галіне беларускай версіфікацыі была прадыктавана найперш "жаданнем прышчапіць да беларускай пісьменнасці здабыткі чужаземнага паэтычнага труда, памагчы атрымаць ёй больш еўрапейскі выгляд"[3]. З імем паэта звязана спроба апрабацыі тых светапоглядных катэгорый, што ляжалі за межамі традыцыйнай паэтыкі і эстэтыкі, але якія не маглі заставацца незапатрабаванымі. Багдановіч прадэманстраваў сапраўды еўрапейскі густ, вялікую культуру творчасці, даў узоры класічнай нацыянальнай версіфікацыі паэзіі. Ён быў першым, хто супрацьпаставіў рамантычнаму ідэалу класічны шляхам кансервацыі сталых форм культуры – найперш еўрапейскай традыцыі, – тым самым цесна прычыніўшыся да эстэтыкі неакласіцызму. Як вядома, для гэтага кірунку ў літаратуры характэрна эмацыйная стрыманасць, пэўны, так бы мовіць, "песімістычны аптымізм", філасофская сузіральнасць жыцця, вера ў магутную сілу красы і мастацтва[4]. Мастацтва неакласіцызму арганічна засвойвае прынцып інтэртэкстуальнасці, культурнага кантэксту ў шырокім значэнні гэтых тэрмінаў. Таму яскравай праявай неакласіцызму Багдановіча варта лічыць яго зварот да класічнай – рымскай і грэцкай – антычнасці, а таксама наследаванне



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

паэтычным канонам французскай парнаскай літаратуры. Калі Купала вырашаў сваю задачу зыходзячы з "унутранага" лона літаратуры, цесна абапіраўся пры гэтым на яе фальклорна-субстатыўныя архетыпы, пакладаўся на ўласна нацыянальную паэтычную прасодыю, то пошукі Багдановіча палягалі ў русле агульнага інтэграцыйнага працэсу літаратур сусветных, што адкрывала шырокую магчымасць засведчыць эстэтычную паўнацэннасць і беларускай літаратуры, увесці яе «ў еўрапейскі і сусветны кантэкст, сцвердзіць яе як з'яву агульнаеўрапейскага парадку, а не толькі "лакальную", "мясцовую"; праз далучэнне да скарбніцы сусветнай культуры адкрыць тыя схаваныя скарбы, якія ёсць у нацыянальнай мове і культуры»[5].

Эстэтызаваны свет паэзіі Багдановіча – вынік напружанай думкі і духа – цесна спалучае папярэднюю еўрапейскую і нацыянальную традыцыі з агульначалавечай духоўнай праблематыкай, спецыфічна трансфармаванай і прыстасаванай да ўласна нацыянальнай эстэтычнай топікі. Нароўні з французскай істотны ўплыў на паэта аказала руская мастацка-эстэтычная і філасофская думка, тыя наватарскія тэндэнцыі, якія шырока захапілі і рускую паэзію "сярэбранага" веку. Апошнія дасягненні багдановічазнаўства пераканаўча засведчылі факт арганічнага ўваходжання творчасці Багдановіча ў жывы літаратурны працэс пачатку XX ст., творчага выкарыстання ім набытку "прадстаўнікоў самых розных плыняў – ад пралетарскіх пісьменнікаў да мадэрністаў..."[6]. Як сцвярджае В. Каваленка, Багдановіч не мог аказацца ўбаку ад такой складанай і супярэчлівай з'явы, якой быў рускі мадэрнізм, што ўзнік на мяжы XIX–XX ст.[7] У ліку тых, хто так або інакш аказваў уплыў на фарміраванне ўласнай філасофска-эстэтычнай сістэмы М. Багдановіча, даследчык называе імёны А. Пушкіна, А. Фета, А. Блока, І. Буніна, В. Брусава, К. Бальмонта, М. Кузьміна, М. Гумілёва, С. Гарадзецкага і інш.

У адрозненне ад Я. Купалы, паэтычны свет якога трымаецца на неўтаймаванай, бурлівай духоўнай энергіі, М. Багдановіч схільны да ўпарадкаванасці сістэмы: ён імкнецца стварыць дасканалую форму, сузіраючы прыгожае. Для Купалы асноўны спосаб пазнання рэчаіснасці – інтуіцыя, для Багдановіча, паэта ярка выражанага інтэлектуальнага складу, – веды. Паэзія Купалы наскрозь суб'ектыўная, глыбока інтымная, ярка эмацыянальная. У лірыцы Багдановіча суб'ект як бы адыходзіць на задні план, а на першы план выступае асноўны аб'ект яго творчасці – форма. У сэнсе вытанчанасці, выкрышталізаванасці стылю Багдановіч значна пераўзыходзіць Купалу, таксама як і ў адносінах эрудыцыі, але ўступае яму – у пачуцці, эмоцыі, а значыць, у сіле мастацкага ўздзеяння. Паэт ідзе ад славеснага выражэння да пачуцця, эмоцыі, а не наадварот. Эмоцыя Багдановіча як бы другасная, яна – больш ад прачытанага, чым ад перажытага. Гэта можна вытлумачыць розніцай паэтычных тэмпераментаў і характарам зарыентаванасці на мастацкія традыцыі. Мастацкія густы Багдановіча фарміраваліся пад уплывам рускай і, у большай ступені, французскай літаратур – адпаведна ў ёй, на што звярталася ўжо ўвага, прасочваецца сувязь з французскімі парнасцамі і сімвалістамі.

Асноўным творчым прынцыпам Багдановіча стала імкненне да універсалізму, касмапалітызм ("космас культуры"), свабоднае выкарыстанне ўсіх магчымых вобразаў, матываў і традыцый сусветнай культуры. "Касмапалітызм" паэзіі Багдановіча – гэта адна з прыступак на шляху спасціжэння нацыянальнага духу. Паэт мэтанакіравана адбірае паэтычныя формы, раней не вядомыя беларускай паэзіі. "Беларускае сярэдневякоўе, антычнасць, Рэнесанс, старажытны Егіпет, ракако, готыка, сербская, украінская, японская, скандынаўская, іспанская і іншыя традыцыі знайшлі сваё адметнае месца ў яго мастацкай практыцы"[8]. У выкарыстанні і спалучанасці розных мастацкіх дактрын, цэлых культурных пластоў Багдановіч ніколькі не ўступае мадэрністам, для якіх не існавала ніякіх культурных, часавых або прасторавых бар'ераў. Складаная і разгалінаваная сістэма асацыятыўных сувязей і запазычванняў вядзе да універсалізацыі кожнага вобраза і матыву і ператварае паэзію Багдановіча ў свайго роду анталогію чалавечай гісторыі і культуры.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Тэматычнае багацце вершаў Багдановіча проста здзіўляючае. Вершы напісаны на самыя разнастайныя матывы: усходнія, антычныя, язычніцкія, хрысціянскія, сярэдневяковыя, рэнесансныя, адраджэнскія, грамадзянска-патрыятычныя. Ёсць вершы, навеяныя творамі мастацтва, адрасаваныя рознай чытацкай аўдыторыі, таварышам па пяру. Значную частку складаюць вершы лірычныя, на вечныя тэмы паэзіі, філасофская лірыка, пейзажныя замалёўкі, якія з'яўляюцца "універсітэтам класічнай паэтыкі", прыкладам "універсалізму паэтычнага варштата" (А. Лойка).

Паказальна імкненне паэта ў сваім крытычным разглядзе паэзіі Купалы звярнуць увагу перш за ўсё на вытанчанасць, паэтычную віртуознасць, высокую мастацкую тэхніку, выпускаючы з поля зроку аголены трагізм і ўнутраную канфліктнасць, ігнаруючы ці наўмысна пазбягаючы гаворкі пра сацыяльную дамінанту творчасці, кіруючыся ў сваіх ацэнках прынцыпамі ідэалістычнай эстэтыкі. Так, у артыкуле "За тры гады", звяртаючы ўвагу на вартасці зборніка "Шляхам жыцця", Багдановіч-крытык пісаў: "З радасцю бачым, што талент Купалы развіваецца, з'яўляюцца новыя мэты, новыя спосабы творчасці, новыя формы і вобразы. Не толькі нядоля нашай вёскі ды нацыянальныя справы Беларушчыны цікавяць яго. Ужо і краса прыроды і краса кахання знайшлі сабе месца ў яго творах. Там-сям прабіваецца жывы гумар. Ёсць колькі санетаў (праўда, не зусім бездаганных), баек, вершаў накшталт народнай песні; ёсць спробы скарыстаць з народных сімвалаў і т. д. Глаўнае ж тое, што ўсё гэта ў многіх вершах Купалы зроблена надзвычайна пекна, з праўдзівым уменнем ды з вялікім пад'ёмам пачуцця. Часта-густа спатыкаецца прыгожая будова верша, цікавая па спляценню строк, расстаноўцы рыфм, ужыванню цэзур; разнастайнасць рытмаў з іх усягдашняй лёгкасцю ды моцным разгонам; краса, свежасць і паўназычнасць рыфм, звінячых не толькі на канцы, але і пасярэдзіне строк; гучнасць слоў, падабраных да верша, і шмат што іншае"[9]. Паказальна і тое, што Купалу, Гаруна, Ядвігіна Ш., Власта, Бядулю Багдановіч-крытык называе пісьменнікамі "зусім асобнага духу", "***і не толькі таму, што яны апісваюць беларускае, мала дзе вядомае жыццё***" (выдзеленае намі. – В. М.)[10]. Галоўнае, на думку Багдановіча, – нацыянальнае пачуццё літаратуры, дзякуючы якому "не толькі нашаму народу, але і **ўсясветнай культуры** нясе яна свой дар"[11]. Менавіта нацыянальныя стымулы набывалі для Багдановіча рашаючае значэнне, станавіліся ўмовай уваходжання ў сусветны культурны кантэкст.

Асабісты прыклад у гэтым Багдановіч паказваў сам. Для паэта не існуе забароненых тэм, наогул чагосьці недаступнага: ён пачувае сябе сапраўды грамадзянінам сусвету, усе "скарбы жыцця" знаходзяцца ў неабмежаваным валадаранні яго розуму. У гэтым выявіла сябе чыста мадэрнісцкая рыса творчасці – культ свайго "я". У Купалы асновай гэтага культу станавілася асобасная эмоцыя, здольная запоўніць сабой увесь свет. У Багдановіча – усемагутнасць ведаў, кніжнасць, адсутнасць перашкод для паэтычнай фантазіі, унутранае любаванне тымі дасканалымі паэтычнымі формамі, якія ён стварае.

Універсалізм Багдановіча распаўсюджваецца і на яго светапогляд. Заўважаецца вельмі яскравая сувязь паэта з тымчасовым філасофска-культsvarалагічным рухам, пошукамі магчымасці стварэння "сусветнай рэлігіі", у аснову якой клаліся розныя светапоглядныя і гісторыка-культурныя дактрыны: "сусветная рэлігія" Канта, тэасофія Блавацкай, розныя варыянты пантэізму, звязаныя з адметнасцю нацыянальных міфалагічных уяўленняў, ніцшэанскія алюзіі, "тэорыя сімвалаў" Пляханава. Гэта не перашкаджала Багдановічу спавядаць пазітывісцкія погляды, заставацца доўгі час прыхільнікам анархізму. Пралamленне многіх філасофска-эстэтычных і грамадска-палітычных дактрын у творчасці сведчыць пра тое, што для Багдановіча-мадэрніста няма іншай ідэалогіі, акрамя ідэалогіі яго свядомасці, якая ўспрымае культурны і філасофскі вопыт чалавецтва як адзінае і непадзельнае цэлае. Багдановіч-мадэрніст бачыў у мастацтве вышэйшую рэальнасць, сваю рэлігію, якой ён служыў да самазабыцця да апошніх дзён жыцця.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

У творчасці і Я. Купалы, і М. Багдановіча спалучаюцца, такім чынам, дзве тэндэнцыі нацыянальнага літаратурнага самавызначэння: адна, якая працягвае ўласна нацыянальныя паэтычныя традыцыі, г. зн. нацыянальна заангажыраваная; другая тэндэнцыя развіваецца ў русле асэнсавання нацыянальнай сутнасці ва універсальных катэгорыях шляхам выяўлення і раскрыцця агульначалавечага зместу вобраза беларуса не ў вузкалакальным, а ў шырокім, сапраўды сусветным плане.

[1] Гл.: Багдановіч М. Поўны зб. тв.: У 3 т. Мн., 1993. Т. 2. С. 287.
[2] Мушынскі М. Навуковая і літаратурна-крытычная спадчына М. Багдановіча. // Багдановіч М. Указ. тв. С. 479.
[3] Багдановіч М. Указ. тв. Т. 3. С. 244.
[4] Нязменная сімпатыя паэта да "высокага", рафінаванага паэтычнага стылю таксама ўяўляецца ў гэтай сувязі своеасаблівай уцелясненай формай красы.
[5] Чабан Т. Космас "Вянка" // Багдановіч М. Указ. тв. Т. 1. С. 508.
[6] Каваленка В. Максім Багдановіч // Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: У 4 кн. Пачатак XX ст. 1900–1917. Мн., 1994. Кн. 2. С. 401.
[7] Там жа. С. 403.
[8] Пыско Н. Творчасць М. Багдановіча ў кантэксце традыцыі "цытатнай" паэтыкі А. Пушкіна і "космасу культуры" рускай паэзіі пачатку XX ст. // Пушкін – Беларуская культура – Сучаснасць. Матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 26 – 27 мая 1999 г. Мн., 1999. С. 332.
[9] Багдановіч М. Указ. тв. Мн., 1993. Т. 2. С. 223–224.
[10] Там жа. С. 229.
[11] Там жа.

***Максімовіч Валерый Аляксандравіч*** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры XX ст. БДУ.

*А.І. БЕЛЬСКІ*

## РЭГІЯНАЛЬНЫ СУБСТРАТ І ЯГО РОЛЯ Ў СТВАРЭННІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВОБРАЗА СВЕТУ (на матэрыяле беларускай паэзіі)

Нацыянальны вобраз свету ў яго этнічна-беларускім вымярэнні і вызначэнні – гэта беларуская светабудова, склад і адметнасць прасторавага мыслення народа. Нацыянальны свет у шырокім разуменні – прыроднае асяроддзе (краявіды, раслінны свет, фауна, кліматычныя ўмовы і інш.), этнакультурны змест існавання, звязаны з пэўным уладкаваннем побыту, мовай, духоўнымі традыцыямі нацыі. Разгорнутасць трактоўкі этнасферы таго ці іншага народа якраз найбольш поўна і ўвасабляе паняцце "нацыянальны космас", прапанаванае Г. Гачавым[1] і паспяхова ўведзенае ў беларускі навуковы кантэкст Т. Шамякінай[2].

За апошняе дзесяцігоддзе наша айчыннае літаратуразнаўства і культуралогія зрабілі чарговыя захады ў вызначэнні адметнасці і асэнсаванні нацыянальнай карціны свету, што бачыцца з'явай заканамернай, даволі сімптаматычнай. Без адчування і разумення ўласнага "я" ў вялікай агульначалавечай супольнасці, моўна-культурнай самаідэнтыфікацыі, глыбокай і трывалай нацыянальнай свядомасці немагчыма ўявіць духоўную паўнацэннасць этнасу, самабытнасць народнай душы і духу, і гэта – аксіяматычная ісціна.

Нацыянальны вобраз свету ствараецца не толькі ў этнічнай свядомасці, але і ў мастацкай культуры і літаратуры пэўнага народа. Цікаваеназіранне ў гэтай сувязі робіць Г. Гачаў, які піша, што паэзія "непасрэдна пералівае прыроду ў слова. Яна слухае: ёй космас падказвае, прырода намаўляе – і адразу нараджаецца слова, настроенае ва унісон, і хоць духоўна, але змяшчае ў сабе лад жыцця"[3]. Літаратура і, у прыватнасці, паэзія глыбока матэрыялізуе ў сабе нацыянальны погляд на прыроду і рэчаіснасць, найбольш ярка выяўляе склад беларускага светаадлюстравання, а класічныя творы наогул у многім прадвызначаюць адчуванне чалавекам прасторавай



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm